**Шляпаў** Сяргей Мікалаевіч // Памяць. Міёрскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: Г. М. Маняк [і інш.] ; уклад. Л. А. Матэленак ; маст. Э. Э. Жакевіч. — Мн. : Беларуская навука, 1998. — С. 555.

## ШЛЯПАЎ СЯРГЕЙ МІКАЛАЕВІЧ

Нарадзіўся 25.6.1965 г. у в. Забор’е Міёрскага раёна. Беларус. Маці, Ганна Фамінічна, хатняя гаспадыня, бацька, Мікалай Сцяпанавіч, жывёлавод саўгаса «Дзісенскі» Міёрскага раёна. У 1980 г. Сяргей скончыў васьмігадовую школу ў в. Іст, у 1984 г. – Боркавіцкае ПТВ № 170. Працаваў трактарыстам у саўгасе «Дзісенскі». У кастрычніку 1984 г. прызваны ў Савецкую Армію Міёрскім РВК. Служыў у Афганістане. Радавы С. М. Шляпаў загінуў 24.3.1985 г. Пахаваны ў в. Іст Міёрскага раёна. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

*...Калона аўтамашын, сярод якіх быў і «КамАЗ» С. М. Шляпава, дастаўляла авіябензін і боепрыпасы ў г. Кабул. У даліне каля перавала Саланг зрабілі прывал. І ў гэты час душманы агнём з гор накрылі калону...*